**Андрэй Захаранка**

**нарадзіўся 8 лютага 1974 году ў Новасібірску. У 1996 годзе скончыў геаграфічны факультэт БДУ, а ў 1999-м - асьпірантуру пры ім. У 2000 годзе апублікаваў у "ARCHE апавяданьне "Кроніка аднае аблогі".**

# Хоку

---

## ЦЭРКАЎКА НА МОГІЛКАХ

*Бітага звона*
*Важкі, іржавы язык*
*Вецер гайдае.*

*Пяе салоўка*
*Над могілкамі ўсьцяж.*
*Чаму так гучна?*

*Вецер у лесе.*
*Нібыта шоргае дождж.*
*Вочы заплюшчу.*

*Ў сэрцы збалелым*
*Колішняй радасьці сьлед*
*Ці адшукаю?*

*Цэрква старая.*
*Могілкі. За крыжамі -*
*Вёскі ускраек.*

*Дзедава хата.*
*Стрэла мяне пустая*
*Лава ля плоту.*

*Дужае вецер.*
*Зьела палову неба*
*Шэрая хмара.*

## ЛЕТНЯЯ НОЧ

*Даўнейшы хутар.*
*Ля сажалкі на ўзьлеску*
*Адзін падмурак.*

## РАЗГЛЯДАЮЧЫ СТАРЫЯ ФАТАГРАФІІ

*Сэрца занyла.*
*Твар яе любы йзноў*
*Раптам убачыў.*

## ПАСЬЛЯ ДАЖДЖУ

*Торгае вецер*
*Важкае лісьце дарма.*
*Дрэвы замёрлі.*

## ГРАФСКАЯ ПУШЧА НАД НЁМАНАМ

*Гронкі парэчак.*
*Вільгацьцю дыхае дол.*
*Цьмяныя шаты.*

## МРОЯ

*Ліпеньскі вечар.*
*Сёньня прыдумаю я*
*Ейныя вусны.*

## ЛЕТНІ ТУМАН

*Абярнула ноч*
*На вільготны дол*
*Малака гладыш.*

## ЛІПЕНЬСКАЯ НОЧ

*Ясная поўня.*
*Ценю уласнаму я*
*Хоку чытаю.*

## СТАРАЯ БЯРОЗА ЛЯ ТОКУ

*Шэпча лістота.*
*Туліцца поўня ў яе*
*Сьветлыя шаты.*

*Сьцісну ў далоні*
*Горкі тутэйшы палын.*
*Сьлёзы расстаньня.*

*Конік сакоча.*
*У срэбнай паўцемры адзін.*
*Месяц узьняўся.*

*Бараўцы-Менск, 1999-2003*